МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

8 мая 2024 г. № 18 (751)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

ДЗЕЛЯ ПАМЯЦІ

# АБАВЯЗАК БЕЛАРУСАЎ — НЕ ДАПУСЦІЦЬ ПАДОБНАГА



**Напярэдадні Дня Перамогі члены Савета Рэспублікі ўсклалі кветкі да месцаў масавага знішчэння людзей у гады Вялікай Айчыннай вайны**

**КАЛІ на мемарыяльным комплексе «Масюкоўшчына», узведзеным у памяць аб звыш 80 тысяч ваеннапалонных, якія ў гады акупацыі Беларусі загінулі ў «Шталагу–352», сенатары і супрацоўнікі сакратарыята верхняй палаты парламента бываюць рэгулярна, то месца масавага пахавання ахвяр генацыду ва ўрочышчы Уручча заканатворцы наведалі ўпершыню. Такім чынам, Уручча — гэта не толькі назва сучаснага сталічнага мікраёна. Гэта яшчэ адзін сімвал болю беларускага народа, месца жудаснай расправы нацысцкіх злачынцаў над ні ў чым не вінаватымі людзьмі, сярод якіх не толькі ваеннапалонныя, а і мірныя жыхары — пераважна жанчыны і дзеці.**



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Аб тым, што ў лясным масіве каля Мінска гітлераўцы і іх памагатыя знішчылі вялікую колькасць людзей, стала вядома адразу пасля вызвалення Беларусі. Акт Надзвычайнай дзяржаўнай камісіі, датаваны ліпенем 1944 года, сведчыў: тут было знішчана звыш 57 тысяч грамадзян. У памяць аб бязвінна расстраляных савецкіх воінах, партызанах і мірных людзях у 1959 годзе на 9-м кіламетры маскоўскай шашы з'явіўся мемарыял. Аднак рэальны маштаб трагедыі ўдалося ўстанавіць толькі нядаўна, калі ў красавіку 2021 года Генеральная пракуратура ўзбудзіла крымінальную справу па факце генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны перыяд. Па папярэдніх ацэнках, у лясным масіве ўрочышча Уручча вечным сном спіць не менш як 100 тысяч чалавек.

## 19 ЯМ-МАГІЛ — ТЫСЯЧЫ АБАРВАНЫХ ЛЁСАЎ

Аб тым, якія страшныя падзеі адбываліся тут больш як восем дзесяцігоддзяў таму, членам Савета Рэспублікі, супрацоўнікам сакратарыята і членам Маладзёжнага савета пры Нацыянальным сходзе падчас наведвання раней невядомых месцаў масавага пахавання мірных грамадзян і ваеннапалонных расказалі генеральны пракурор Андрэй Швед і кіраўнік следчай групы Генеральнай пракуратуры Валерый Талкачоў.

Згодна з архіўнымі данымі, з 1941 да 1944 года гітлераўцы прывозілі мірных жыхароў, ваеннапалонных з Мінска, бліжэйшых населеных пунктаў і нават з Расіі ў лясны масіў, дзе распраўляліся з імі хутка і бязлітасна — выстралам у галаву. Затым мёртвыя целы ўкладвалі ў некалькі слаёў і засыпалі зямлёй.

*(Заканчэнне на 9-й стар.)*

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9



# Ушанаванне ветэранаў, адукацыя моладзі, закладка алеі

Першы майскі тыдзень сенатараў быў насычаны падзеямі

**Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы, старшыня Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Ала Смаляк павіншавала з надыходзячым Днём Перамогі ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, якія пражываюць у Брагінскім і Хойніцкім раёнах.**

У Брагіне самыя сардэчныя пажаданні ад сенатара прымаў Васіль Нікалаенка, у Хойніках — Іван Шкурко, Васіль Гардзеенка. Парламентарый таксама пацікавілася, ці патрэбна дапамога ветэранам, і, вядома, ад усёй душы падзякавала вызваліцелям за іх подзвіг.

* * *

Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Сівец і старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Міхаіл Русы прынялі ўдзел у адкрыцці кабінета рэнтгенакамп'ютарнай дыягностыкі ў Петрыкаўскай цэнтральнай раённай бальніцы.

* * *

Член Пастаяннай камісіі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, генеральны дырэктар прыватнага вытворча-гандлёвага ўнітарнага прадпрыемства «Вітбудтэхмаш» Андрэй Сідараў сумесна з аддзелам па адукацыі Бешанковіцкага райвыканкама сустрэўся з навучэнцамі і працоўнымі калектывамі сярэдніх школ № 1 і № 2 г. п. Бешанковічы. Галоўная тэма сустрэчы — пытанні адукацыі моладзі.

«Дзеці — наша будучыня, і гэта будучыня ў нашых руках. Задача настаўніка — выявіць талент дзіцяці і дапамагчы яго развіць. Самае важнае — прысвяціць сябе выхаванню вучняў на аснове патрыятызму, любові да Радзімы і поўнай самааддачы, прытрымліваючыся ідэалаў дабра, гонару і прыстойнасці. Уклад у адукацыю дзяцей — найлепшыя інвестыцыі ў будучыню, — адзначыў сенатар. — «Вітбудтэхмаш» з'яўляецца арганізатарам гарадской алімпіяды па фізіцы «Элемент інжынеры». Я з радасцю прапаную вам падтрымку. Нашы канструктары ўсталююць у вашых школах неабходныя праграмы для будучых інжынераў, правядуць для іх урокі».

Дасягнута дамоўленасць аб заключэнні з аддзелам па адукацыі райвыканкама пагаднення аб супрацоўніцтве ў мэтах правядзення прафесійна-арыентаваных мерапрыемстваў для навучэнцаў і іх бацькоў.

* * *

Член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве, член Вышэйшага палітычнага савета Беларускай партыі «Белая Русь», старшыня Брэсцкага абласнога Савета дэпутатаў Ігар Брылевіч сумесна са старшынёй Брэсцкага гарвыканкама С. Лабадзінскім, старшынёй Брэсцкага гарсавета А. Філановічам, кіраўніцтвам і актывам Брэсцкага абласнога аддзялення Беларускай партыі «Белая Русь», дэпутатамі і моладдзю прынялі ўдзел у закладцы «Алеі Адзінства». Мерапрыемства прайшло ў гарадскім садзе Брэста.

**Паводле прэс-службы Савета Рэспублікі.**